УДК 930.2:27

# ПРЫЧЫНЫ ВЯДЗЕННЯ КАСЦЕЛЬНЫХ ХРОНІК У РЫМСКА-КАТАЛІЦКІХ ПАРАФІЯХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX ст.

**Сыцько Кірыл Валер'евіч,**
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

*У тэксце разглядаюцца фактары, якія паўплывалі на стварэнне і вядзенне ў першай палове XX ст. хронік рымска-каталіцкіх парафій на тэрыторыі Беларусі.*

Парафіяльныя хронікі Рымска-каталіцкага касцёла першай паловы XX ст. з'яўляюцца ўнікальным відам гістарычных крыніц, у якіх пробашчы фіксавалі гісторыю асобна ўзятай парафіі ад моманту яе заснавання да моманту, сучаснага ім. Сёння вядомы шэраг падобных дакументаў, створаных у 1930-я гг. у касцёлах у Ішчальне, Свянцянах, Дудах, Волдацішках, Рэплі, Клюшчанах і шмат інш.

Па паходжанні тэксты парафіяльных хронік уяўляюць дыскрэтныя сінкрэтычныя зводы інфармацыі з матэрыялаў парафіяльных архіваў, гістарыяграфічных прац, успамінаў парафіян і ўласных назіранняў ксяндзоў-храністаў [2, с. 194–195]. Структура гэтых наратываў і іх крыніцазнаўчы патэнцыял даследаваны, але выклікаюць пытанні тыя фактараў, якія паўплывалі на стварэнне падобных дакументаў у XX ст. Так, у часопісе "Гамілетыка" ў 1900 г. адзначалася, што гэтыя хронікі могуць стаць аргументам у абароне тэрыторыі парафіі; адлюструюць яе гісторыю, традыцыю; будуць інструментам для злічэння наяўнай маёмасці з інфармацыяй, запісанай у візітацыях [7, с. 627].

Трэба адзначыць, што дадзеныя аргументы выглядаюць сумнеўным стымулам такой працаёмкай дзейнасці, як напісанне вялікіх наратыўных прац і, трэба думаць, не паўплывалі на іх стварэнне. Так, парафіяльныя хронікі сапраўды былі важным інструментам для праверкі візітацый у шэрагу краін (*напрыклад – у Аўстрыі*) [4, с. 18]. Аднак у беларускіх губернях Расійскай імперыі (*пасля і ў Заходняй Беларусі ў Польскай Рэспубліцы*) візіты, пачынаючы з другой паловы XIX ст., паступова гублялі сваю юрыдычную моц і станавіліся хучэй традыцыяй, чым дакументам, які меў сапраўдную сілу [3, с. 69]. Калі гаварыць аб дэклараванай абароне тэрыторый, то цяжка ўявіць, якім чынам гэта працавала ў перыяд паўсямеснай секулярызацыі і паступовай страты ўплыву рэлігійных устаноў на дзяржаву і соцыум. Што тычыцца адлюстравання гісторыі парафіі, то шмат якія святары не бачылі ў гэтым патрэбы, разглядаючы стварэнне наратыўных гістарычных зводаў як дадатковую папяровую працу [6, с. 4]. Доказам таго, што святары не прыдалі прыведзе-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ным вышэй аргументам ўвагі з'яўляецца той факт, што да 1930-х гг. напісана толькі шчучынская парафіяльная хроніка (*1912–1917 гг.*), астатнія датуюцца 1932–1939 гг. Такім чынам, варта шукаць іншыя фактары, якія паўплывалі на стварэнне гэтых гістарычных крыніц.

Улічваючы падабенства метадаў стварэння парафіяльных хронік з падобнымі дакументамі ранейшых перыядаў (*кляштарнымі хронікамі, беларуска-літоўскімі, рускімі летапісамі*), варта экстрапаліраваць звесткі аб іх. Т. В. Гіман бачыў у летапісанні ідэалагічную функцыю. Да летапісаў і хронік звярталіся для таго, каб атрымаць інфармацыю аб мінулым для доказу нечага ў сучаснасці [1, с. 14].

Аналагічна, парафіяльныя гістарычныя крыніцы маглі выкарыстоўвацца для таго, каб даказаць неразрыўнасць мясцовага жыцця з касцёлам. Аб гэтым сведчыць адлюстраванне ў тэкстах касцельных хронік штодзённасці жыхароў тэрыторый Беларусі рымска-каталіцкага веравызнання выключна праз прызму каталіцкага культу; апісанне дзеянняў гэтага рэлігійнага інстытута як установы, якая апякала вернікаў і ўсялякім чынам дапамагала людзям. У асвятленні касцельных хронік жыццё вернікаў, якія пражываюць у межах кожнай асобнай парафіі, набывае атрыбуты іманентнасці, а таксама імплазіўнасці, то бок – некаторай унутранай ізаляванасці і закальцаванасці быцця верніка ў межах тэрыторыі, на якую распаўсюджвалася дзейнасць парафіяльных святароў.

Важнасць ідэалагічна-выхаваўчай ролі касцельных хронік бачыў і падкрэсліваў Віленскі арцыбіскуп Рамуальд Ялбжыкоўскі (*гады біскупства – 1926–1955*), які прапаноўваў зачытваць іх падчас гамілій. Ён жа і з'яўляўся галоўным прыхільнікам ідэі адраджэння летапісання. Шмат якія святары адзначалі ў сваіх творах, што стварылі крыніцы толькі таму, што іх прасіў арцыбіскуп. Так, кс. Т. Калінскі называў галоўным фактарам напісання хронікі парафіі ў Нараўцы вусную просьбу Р. Ялбжыкоўскага, зробленую падчас візітацыі парафіі 23 мая 1932 г. [5, с. 20]. Аб тым, што арцыбіскуп быў асабіста зацікаўлены ў стварэнні хронік, сведчыць і тое, што пасля высылкі яго ў Беласток, адным з першых прынятых ім дакументаў быў дэкрэт аб абавязковым вядзенні хронік у польскай частцы парафій былой Віленскай архідыяцэзіі [8, с. 180]. У выніку прыняцця гэтага дэкрэта, ва ўсіх парафіях Беласточчыны былі створаны парафіяльныя хронікі, якія на дадзены момант захоўваюцца ў Беластоцкім архідыяцэзіяльным архіве. Трэба думаць, што ў дадзеным выпадку згуляў сваю ролю аўтарытэт, які меў арцыбіскуп Ялбжыкоўскі сярод кліру.

Усе парафіяльныя хронікі, створаныя па просьбе Р. Ялбжыкоўскага святарамі, не мелі строгіх фармулярaў, што дазваляла пробашчам уносіць у тэкст свае думкі, заўвагі і адлюстроўвала іх эстэтычнае ўспрыманне гістарычнай рэчаіснасці. Напрыклад, кс. Фларыян Нявера ў надрукаванай пад тытулам "Гісторыя касцёла парафіяльнага ў Жырмунах (1522 – 1624 – 1788 – 1938)" хроніцы апісаў усіх без выключэння жырмунскіх святароў, якія служылі да яго, як станоўчых персанажаў. Яны, паводле крыніцы, працавалі на карысць касцёла, шчыра спачувалі парафіянам, здзяйснялі для іх выключна добрыя ўчынкі і былі патрыётамі Рэчы Паспалітай (*змагаліся супроць русіфікацыі, адчынялі падпольныя польскамоўныя школы і г. д.*), мелі высокі ўзровень адукаванасці і начытанасці, праводзілі актыўную душпастырскую дзейнасць [6, с. 47–55]. У па-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

добнай эстэтызацыі і ідэалізацыі гістарычнай рэальнасці бачыцца яшчэ адзін магчымы чыннік, які паўплываў на стварэнне парафіяльных хронік – фактар асабістай зацікаўленасці асобнага святара ў працэсе стварэння крыніцы як форме мастацкай і сацыяльнай дзейнасці. Гэта не толькі не абвяргае ідэалагічную функцыю памянёных гістарычных крыніц, але і спалучаецца з ёй. Так, з дапамогай эстэтызацыі дзейнасці касцёла паказваецца яго станоўчая роля ў сацыяльным і культурным развіцці соцыуму на пэўнай тэрыторыі.

Такім чынам, найбольш верагодным галоўным фактарам стварэння ў парафіях Рымска-каталіцкага касцёла на тэрыторыі Беларусі парафіяльных хронік ў першай палове XX ст. з'яўлялася асабістая зацікаўленасць у існаванні падобных гістарычных крыніц Віленскага арцыбіскупа Рамуальда Ялбжыкоўскага, які бачыў у іх інструмент ідэалагічна-выхаваўчага характару. Натуральна, што падобная гіпотэза не абвяргае магчымасць зацікаўленасці святароў у эстэтызацыі і рамантызацыі гісторыі касцёлаў, у якіх яны служылі.

## Літаратура


1. Гимон, Т. В. Для чего писались русские летописи? / Т. В. Гимон // Журнал ФИПП. – 1998. – № 1 (2). – С. 8–16.
2. Сыцько, К. В. Парафіяльныя хронікі першай трэці XX ст. як крыніца па гісторыі Рымска-каталіцкай Царквы ў Беларусі / К. В. Сыцько // Архіварыус: зб. навук. павед. і арт. – 2017. – Вып. 15. – С. 188–196.
3. Dębowska, M. Akta wizytacyjne w strukturze zasobów historycznych archiwów diecezjalnych w Polsce / M. Dębowska // Połroznik ABMK. – 2012. – Tom 97. – S. 65–71.
4. Erdinger, A. Das Pfarrgedenkbuch / A. Erdinger // Theologische praktische Quartalschrift. – 1892. – Jahrg. 45. – S. 16–21.
5. Kaliński, T. Monografia parafii Narewka, 1932, mps. // Parafia świętego Jana Chrzciciela w Narewce [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: http://www.narewka.archibial.pl/files/Historia_parafii_Narewka.pdf. – Data dostępu: 22.02.2020.
6. Niewiero, F. Historia Kościoła Parafialnego w Zyrmunach (1522 – 1624 – 1788 – 1938) / F. Niewiero. – Lida, 1939. – 104 s.
7. P. K. (Odszyfrowanie nieznane) Kronika parafialna / K. P. // Homiletyka. – 1900. – R. 3, T. 5, – S. 627–630.
8. Szot, P. Kronika parafii Majewo autorstwa Mieczysława Skrobota // P. Szot / Rocznik teologii katolickiej. – Tom VI. – 2007. – S. 179–192.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова